*Окончание таблицы*

| | |
|---|---|
| гостинице «Метрополь», а потом вывезли в Быховскую крепость. Начальником штаба Ставки и исполняющим обязанности Верховного главнокомандующего стал генерал Н. Н. Духонин. Утром 26 октября 1917 г. в Могилёве стало известно о победе пролетарской революции в Петрограде. Духонин отказался признать Совет Народных Комиссаров, за что был отстранён от должности. Духонин предполагал на автомобилях выехать в Киев и перенести туда Верховное командование, но был задержан Георгиевским батальоном.<br>На следующий день в Могилёв пришли большевики во главе с Главнокомандующим Крыленко. На вокзале толпа красноармейцев подняла на штыки генерала Духонина. | Вскоре фронт продвинулся к Могилёву, и Ставка во главе с Крыленко переехала в Орёл. В Могилёве во главе большевистской власти стал прапорщик Гольман.<br>12 марта 1918 г. в город вошёл польский корпус генерала Довбор-Мусницкого, а 25 мая — германские войска. В течение почти восьми месяцев могилевчане жили одновременно в двух государствах. В ноябре, согласно денонсации Брестского договора, немецкие войска оставили Могилёв, и 31 октября 1918 г. в город вошли отряды Красной Армии.<br>В городе была восстановлена Советская власть.<br>23 декабря 1918 г. начал работу Могилёвский городской Совет. |

***VI. Комплексное применение знаний.***

Учащимся предлагается заполнить третью колонку таблицы.

| Знаем | Хотим узнать | Узнали |
|---|---|---|
| | | |

***VII. Рефлексия.***

Проводится по методике «ПОПС — формула».

П — я считаю, что ... .
О — потому что ... .
П — например ... .
С — поэтому ... .

***VIII. Подведение итогов урока.***

# Першабытныя жывёлаводы і земляробы ў бронзавым і жалезным вяках

**Урок гісторыі, VI клас**

**Т. В. Пацёмкіна, настаўніца гісторыі Шаламоўскай базавай школы Слаўгарадскага раёна**

**Мэта:** пазнаёміць вучняў з пранікненнем індаеўрапейскіх плямён на Беларусь і афармленнем вытворчай гаспадаркі.

**Задачы:**

- *навучання:* ажыццявіць з вучнямі ўмоўнае падарожжа ў гісторыю засялення беларускіх зямель старажытнымі жыхарамі;
- *развіцця:* праз разважанне над гістарычнымі фактамі і з'явамі развіваць мысленне вучняў, фарміраваць у іх першапачатковыя аналітычныя здольнасці;
- *выхавання:* выхоўваць разуменне каштоўнасці гістарычных ведаў для кожнага чалавека.

**Паняцці:** *агнявое земляробства, балты, ворнае земляробства, вытворчая гаспадарка, германцы, індаеўрапейцы, матычнае земляробства, славяне.*

**Тып урока:** камбінаваны.

**Абсталяванне ўрока:** карта або картасхема размяшчэння індаеўрапейскіх плямён у межах Беларусі, карткі-схемы «Індаеўрапейцы», «Пераход да вытворчай гаспадаркі», запіс на класнай дошцы тэмы, плана.



gisdapamoga.by
gisdapamoga.by

**План**

1. Пранікненне індаеўрапейцаў.
2. Распаўсюджванне жывёлагадоўлі.
3. Першыя земляробы.

**Заданне:** § 4. Пытанні і дадатковыя заданні вучні запісваюць пад дыктоўку ў сшыткі.

**Ход урока**

***I. Арганізацыйны момант.***

Настаўнік выклікае да дошкі трох вучняў. Адзін з іх дапісвае лагічны ланцужок:

Род → → →

Другі працуе з датамі: 100 – 35 тыс. гадоў назад, 10 – 5 тыс. гадоў назад.

Трэці запаўняе табліцу:

| Асабістая ўласнасць | Калектыўная ўласнасць |
|---|---|
| | |

Затым вучням раздаюцца карткі з заданнямі.

**Картка 1**

Складзіце расказ, у якім апішыце агульны сход племені.

**Картка 2**

Адкажыце на пытанні:

1. Як называецца група людзей або калектыў кроўных родзічаў? (Абшчына.)
2. Як называецца трывалае аб'яднанне некалькіх родаў? (Племя.)
3. Самы вопытны чалавек у родзе? (Старэйшына.)

**Картка 3**

Разгледзьце ілюстрацыю.

Раскажыце пра дзейнасць старажытных людзей. Хто гэты чалавек у цэнтры?

У час выканання практычных заданняў настаўнік праводзіць франтальную гутарку з астатнімі вучнямі.

**Пытанні і заданні**

1. Чаму старажытныя жыхары Беларусі не маглі жыць паасобку?
2. Якое аб'яднанне людзей называецца абшчынай?



gisdapamoga.by

3. Па якой прымеце вызначаецца мацярынская родавая абшчына (мацярынскі род)?

4. Хто распараджаўся маёмасцю родавай абшчыны?

5. Назавіце асноўныя рысы, уласцівыя племені.

6. У які час роды на тэрыторыі Беларусі пачалі аб'ядноўвацца ў плямёны?

7. Растлумачце паняцце «першабытны лад».

Пасля гутаркі правяраецца выкананне рознаўзроўневых заданняў (калі яны даваліся на дом вучням). Затым настаўнік ацэньвае пісьмовыя заданні.

**_Вывучэнне новай тэмы_**

**! Успомнім**

*Настаўнік.* Мы ўжо ведаем, што апошні ледавік адышоў з тэрыторыі Заходне-Еўрапейскай раўніны 8 тыс. гадоў да н. э. Клімат паступова робіцца цёплым. Пачынаецца пасляледавіковы перыяд. Прыкладна 3 тыс. гадоў да н. э. шматлікія плямёны жывёлаводаў-качэўнікаў рассяліліся на вялікай тэрыторыі, у тым ліку і ў Еўропе. Гэта былі індаеўрапейцы. Першапачаткова яны жылі на тэрыторыі Малой Азіі непадалёку ад Ірана. Ваша задача — прачытаць першы пункт параграфа і знайсці адказ на наступнае пытанне: «Калі індаеўрапейскія плямёны праніклі на тэрыторыю Беларусі, і на якія групы яны падзяліліся?».

А цяпер запоўніце схему:

**Індаеўрапейцы**

↙ ↓ ↘

Балты — Славяне — Германцы

***Фізкультхвілінка.***

— Успомнім, якая гаспадарка называецца прысвойвальнай.

*Расказ настаўніка аб пераходзе ад палявання да жывёлагадоўлі, калі людзі пачалі заводзіць сабак, быкоў, кароў, свіней і іншых хатніх жывёл.*

Тры тысячы гадоў назад да нашай эры людзі пачалі сеяць пшаніцу, проса, гарох, боб.

**Земляробства**

↙ ↓ ↘

Матычнае — Падсечна-агнявое — Пашавае

— Займаліся яны рыбалоўствам і бортніцтвам. З'явіліся і першыя шахцёры.



**Барана-сукаватка**



**Крамянёвыя сярпы бронзавага веку**



**Драўлянае рала, знойдзенае пад вёскай Капланавічы Клецкага раёна**

— Запішыце ў сшытку, што такое вытворчая гаспадарка, і перанясіце схемы з дошкі ў сшыткі.

***Замацаванне.***

— Дапішыце, з якіх заняткаў узніклі жывёлагадоўля і земляробства.

| |
|---|
| Паляванне<br>↓<br>Збіральніцтва<br>↓<br>Прысвойвальная гаспадарка<br>↓<br>Жывёлагадоўля<br>↓<br>Земляробства<br>↓<br>Вытворчая гаспадарка |

***Дамашняе заданне:*** § 4. Пытанні на с. 21—22.

***Рэфлексія.***

— Адкажыце на пытанні: што вы даведаліся на ўроку? Што змянілася ў гаспадарчым жыцці?

*Адказы вучняў.*

gisdapamoga.by
gisdapamoga.by

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Гісторыя Беларусі: паўрочныя тэсты : 5, 6, 7-ы кл. : дапам. для вучняў агульнаадукац. шк. / П. А. Лойка, А. М. Гардзіенка. — Мінск : Юнипресс, 2004. — С. 24—32.
2. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст. : вучэб. дапам. для 6-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. мовай навучання / Г. В. Штыхаў, С. М. Цемушаў, В. У. Ракуць; пад рэд.: Г. В. Штыхава, Ю. М. Бохана. — Мінск : ВЦ БДУ, 2009. — С. 19—22.
3. Дакументы і матэрыялы па гісторыі ў сярэднія вякі (VI—XV стст.) / Г. В. Штыхаў. — Мінск : Нар. асвета, 1998.

# Личность и политика

## Урок обществоведения, X класс

**В. П. Пранович**, учитель истории и обществоведения средней школы № 10 имени С. Ф. Рубанова г. Слуцка

***Каждый урок, включённый в программу учебного предмета «Обществоведение» за X класс для учреждений, обеспечивающих получение общего среднего образования с 11-летним сроком обучения, несёт в себе определённую смысловую информацию, дополняя предыдущий.***

***Урок «Личность и политика» изучается в теме 3 «Политико-правовая сфера жизни общества», § 18, является шестым по счёту и, можно сказать, завершает данную тему. Подготовлен для учащихся, у которых сформированы навыки самостоятельной работы. Однако он может успешно проводиться и в классах со слабоуспевающими учащимися, так как основной вид работы связан с текстом учебника, к которому ученик во время урока неоднократно обращается. Это позволяет учащимся более успешно овладевать знаниями, умениями и навыками, необходимыми для содействия социально зрелой творческой личности, способной определить пути конструктивной самореализации и активно включиться в созидательную деятельность белорусского общества.***

***Решать поставленные учебные задачи можно разными способами, для этого и создаются многочисленные педагогические технологии. На мой взгляд, при изучении данной темы наиболее эффективна технология развития критического мышления школьников.***

Цель: содействие становлению социально зрелой личности учащихся для активного включения в созидательную деятельность и понимания основных тенденций развития общества.

Задачи:

• *образовательная:* продолжить работу по формированию у учащихся необходимых знаний в политико-правовой сфере жизни общества для их эффективного применения в практической деятельности;

• *коррекционно-развивающая:* развивать у учащихся правовую, политическую культуру личности, а также культуру их мышления и общения;

• *воспитательная:* воспитывать самостоятельность, формировать гражданское самосознание, ответственную социальную позицию, патриотизм, конструктивный опыт общения.